Зайко А.М., студ. Гр.401 ФТБКіСМ
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Лабачэўская В.А.
канд. мастацтвазнаўства, дацэнт

# КУЛЬТАВЫЯ ДРЭВЫ: АБГРУНТАВАННЕ ДЛЯ ЎКЛЮЧЭННЯ Ў ДЗЯРЖАЎНЫ СПІС ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З развіццём навукі і тэхнікі, ва ўмовах працэсу глабалізацыі, сусветнае грамадства сутыкнулася з працэсам глакалізацыі. “Працэс усеўзрастаючага звужэння часу і прасторы” прывёў да непазбежнай дэтэрытарызацыі, павышэнню markdown розна кшталту міграцый: эканамічных, палітычных, культурных [5, с.149]. Як вынік, стала праблема сусветнага масштабу па захаванні культурнай спадчыны (асабліва нематэрыяльнай). У першую чаргу нацыянальнай, дзеля захавання і магчымай пераемнасці адметнасцяў свайго нацыянальнага багацця, светапогляду, гісторыі, фальклору.

Самы вялікі ўплыў на ахову духоўнай спадчыны, на інстытуцыі і сродкі яе выканання аказваюць такія арганізацыі як UNESCO і WIPO (Сусветная арганізацыя інтэлектуальнай уласнасці) [5, с. 151]. UNESCO сфармулявала Канвенцыю аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны (2003г.), якая арыентуецца на эфектыўныя спосабы і сродкі аховы цесна ўзаемазвязаных як матэрыльнай, так і нематряльнай састаўных культур [5, с.151]. Канвенцыя была ратыфікавана Беларуссю ў 2004 г.

Адным з метадаў вырашэння гэтага пытання ў Беларусі стала стварэнне *“Дзяржаўнага спісу гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь”*, падрыхтаванага Упраўленнем па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Праца з’яўляецца вынікам фарміравання нацыянальнага ўліку гісторыка-культурных каштоўнасцей, пачатак якому паклаў Закон Рэспублікі Беларусь ад 12 лістапада 1992 г. *“Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны”*. Усяго ў Дзяржаўны спіс уключана 4787 гісторыка-культурных каштоўнасцей нашай

краіны: гэта помнікі археалогіі, архітэктуры, гісторыі, горадабудаўніцтва, мастацтва і культуры [1].

Трэба адзначыць, што пералік культурных каштоўнасцей, які існуе зараз, неканчатковы. Па дзеючым заканадаўстве любая юрыдычная або фізічная асоба ў пісьмовай форме з абавязковым абгрунтаваннем можа ўнесці ў Міністэрства культуры прапанову аб наданні матэрыяльнаму аб’екту або нематэрыяльнаму праяўленню творчасці чалавека статуса гісторыка-культурнай каштоўнасці. Міністэрства культуры забяспечвае разгляд такіх прапаноў Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай радай па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь [2].

Паспрабуем абгрунтаваць неабходнасць уключэнне культавых дрэў у пералік аб’ектаў культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

Дрэва ў касмічным успрыманні беларусаў асацыявалася з мадэллю пабудовы свету, з універсальным сімвалам, які аб’ядноўвае усе сферы сусвету (калі крона сімвалізуе свет вечнасці, то карані адпавядаюць зоне існавання хтанічнага свету) [4, с. 151]. Культ дрэва мае архаічныя вытокі і звязаны з анімістычнымі вераваннямі. Так, паводле легенд і павер’яў яны жывыя, могуць слухаць, адчуваць, размаўляць, а калі іх ссекчы, то будзе існці кроў і будуць чутны стогны [3, с. 60]. Увогуле, за нанясенне шкоды культавым дрэвам (зрыванне кары, рубку, зламанне галін, спальванне і г.д.) чалавек наказваўся цяжкай хваробай (вар’яцтва, слепата, параліч). Спроба кампенсаваць урон, напрыклад пасадка новага дрэва замест высечанага, змякчае пакаранне і прыносіць палёгку. Культавае дрэва згарэўшае або паваленае ад старасці таксама заставалася недатыкальным. Як і іншыя святыні, культавыя дрэвы “супрацьстаялі” перамяшчэнню. Так лічылася, што ссечанае дрэва можа зноў апынуцца на сваім месцы [3, с. 61].

У беларусаў зафіксаваны абрадавыя практыкі і фальклорныя матэрыялы, звязаныя з культавымі дрэвамі. У фальклоры засталося шмат легенд, песень, казак, замоў, у якіх фігуруюць дрэвы, як сакральныя,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

найчасцей цэнтральныя аб'екты сусвету. Захаваліся павер'і аб практыках, якія павінен быў выканаць чалавек для атрымання пэўнага выніку: пралезці праз шчыліну ў дрэве для аздараўлення, прытуліцца да яго і інш. Найчасцей абрадавыя практыкі, звязаныя з культавымі дрэвамі, мелі аброчную форму або форму ўзаемаабмену, калі просьба выконвалася за align рознага роду ахвярапрынашэнне: хлеб, зерне, грошы, тканіны і ўсё звязанае з імі, часам мела месца свайго роду ахвяра ў выглядзе застаўленага на дрэве адзення.

Аб культавай ролі дрэва сведчыць і распаўсюджанасць звычаю узводзіць цэрквы там, дзе стаялі дрэвы, шануемыя мясцовым насельніцтвам, і наадварот – адзначаць дрэвам месца былога тут раней храма. У славян распаўсюджана практыка будаваць цэрквы недалёк ад дрэва, на якім з'явілася ікона (часта за немагчымасцю ссекчы гэта дрэва, якое “не паддаецца” сякеры). Ёсць звесткі аб ствалах або пнях культавых дрэў, якія зберагаюцца ўнутры цэркваў [3, с.65].

Таксама трэбы адзначыць цесную сувязь культавых дрэў з сакральнымі крыніцамі, камянямі, аброчнымі крыжамі, якія ўтвараюць прошчы і капішчы (хвоя на прошчы каля в.Будча Ганцавіцкага р-на, дуб “Волат” на Мінскім капішчы, в.Шчыткавічы Страдарожскі р-н і інш.). Комплексы святынь фарміраваліся звычайна за межамі паселішча, часцей у лесе. Прычынай іх стварэння звычайна быў калектыўны або індывідуальны зарок. Выбар месца абумоўлены наяўнасцю там маркіраванага прыроднага аб'екту аднаго ці некалькіх, з'яўленнем іконы або іншага цудоўнага здарэння.

Сярод культавых дрэў першай месца займае у традыцыйнай абраднасці *дуб*. Ён увасабляе моц, сілу, мужчынскі пачатак. Раннія сведчанні аб шанаванні дуба ў славян датуюцца X-XII стст. У больш познія часы дрэва зберагло сваё значэнне святыні, месца здзяйснення хрысціянскіх і язычніцкіх абрадаў, у тым ліку і ахвярапрынашэнняў, і ў гэтым сэнсе дуб выступаў як аналаг храма. Пад пагрозай заўчаснай смерці яго забаранялася ламаць, секчы, зразаць. Лічылась, што любая спроба нанесці гэтаму дрэву шкоду звернецца няшчасцем для гэтага чалавека або нават для ўсіх, хто жыве побач. Дубы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лічыліся і месцам, дзе знаходзіліся міфалагічный персанажы. У павер'ях ўсходніх славян на вялізарныя дубы (як і на горы) зляталіся ў купальскую ноч ведзьмы і нячыстая сіла. У беларускім фальклоры дуб фігуруе ў якасці Сусветнага дрэва, таму каля яго падножжа знаходзіцца Змей, а таксама воўна і іншыя рэтуальныя прадметы; у міфалогіі ў дупле дуба хаваюцца ад грамаўніка-Перуна змей, сокал і іншыя яго праціўнікі; у валачобных песнях пры апісанні ідэальнага двара гаспадара згадваецца дом, пабудаваны з дуба; у замовах ад гадаў, таксама фігуруе дуб [4, с. 153]. Увогулле, дуб, як архетып увасаблення Сусветнага дрэва, праглядаеца амаль ва ўсіх жанрах фальклору. Ва ўсходніх славян паўсюдна распаўсюджана практыка "пратасквання" хворага праз дрэва, якое расколата маланкай, радзей – праз адтуліну пад вялікімі каранямі і нават праз веткі. Асабліва часта пратасквалі дзяцей, якія хварэлі на сухоты і начніцы, кволых, хворых грыжай, эпілепсіяй, малярыяй і інш. Найчасцей бацькі стаялі па два бакі дрэва і тройчы перадавалі адно аднаму дзіця. Пры гэтым застаўлялі на дрэве кашулю дзіцяці [3, с. 67]. Як і шматлікія іншыя дрэвы, дуб быў аб'ектам, на які сімвалічна перанасілі хваробы. У народнай медыцыне дуб звязваецца з лячэннем зубоў, хвароб горла і лёгкіх. Дубовыя галінкі выкарыстоўваліс як абярэг – перад купальскай ноччу, каб абараніць дом і скаціну ад нячыстай сілы.

Такім чынам сярод найбольш шануемых дрэў з культавымі практыкамі ў беларускай традыцыйнай культуры патрэбна адзначыць: *дуб* (в. Царковішча Ушацкага р-на, в. Адэлькавічы на Слонімшчыне, на беразе р. Мядзелкі ў Паставах, в.Прынта Вілейскі р-н), *хвою* ("Неадальская хвоя" в.Недаль Барысаўскі р-н, в.Старыца Капыльскага р-на, "Княжая хвоя" каля в.Нарач Вілейскага р-на, в.Пудзічы Салігорскага р-на), *ліпу* (в.Капланцы Бярэзінскі р-н, на выспе в.Неспіш на Браслаўшчыне, в.Чарнякова Бярозаўскага р-на), *грушу* (в.Збляны Лідскага р-на, п. Жыровічы Слонімскага р-на) [4, 3].

Прастора, "святыя месцы", дзе знаходзіліся ці знаходзяцца культавыя дрэвы, звязаны з нематэрыяльнай спадчынай, бо менавіта там адбываліся

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абрадавыя практыкі. Такія прасторавыя кропкі могуць быць ўключанымі ў Спіс нематэрыяльнай спадчыны, як культурныя ландшафты.

На вялікі жаль, лакальныя і нацыянальныя культурныя прасторы, а дакладней аб’екты сакральнай геаграфіі Беларусі, якія неўключаны ў спіс культурных каштоўнасцей, знаходзяцца сёння ў інфармацыйным, духоўным і фізічным заняпадзе. Не ўсе, але большасць. На мой погляд, галоўная прычына гэтага – інфармацыйныя бар’еры. Зацвярджэнне абгрунтавання для ўключэння ў “Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь” культавых дрэў і іншых аб’ектаў сакральнай геаграфіі нашага краю дае магчымасць зберагчы не толькі самі аб’екты, але і практыкі, фальклор, звязаныя з імі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спіс выкарыстанай літаратуры:

1) Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2008 г., № 222, 5/28291

2) 14 мая 2007 г. № 578 «Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасцей» (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2007 г., № 119, 5/25167

3) Славянские древности. Этнолингвистическии словарь / Под ред. Н. И. Толстого. М., 1995. Т. 2.

4) Беларуская міфалогія: Энцэклапед.слоўн. / С.Санько [ і інш.]; склад. І Клімовіч. – 2-ое выд., дап. – Мн.: Беларусь, 2006. – 599с.: іл.

5) Раса Чепайтене. Культурное наследие в глобальном мире. Вильнюс : ЕГУ, 2010. – 296 с. (перевод с литовского Марии Завьяловой)

6)Fischer A. Drzewa w wierzeniach i obrz^dach ludu polskiego // Lud 1937/35/15:60-76;

7)Henslowa M. Rosliny dziko rosnace w kulturze ludu polskiego // Archiwum etnograficzne. Wroclaw, 1962/25;

8)Karwicka T. Zakazy zwia_zane z drzewami motywujace je wierzenia // EP 1973/17/1:131-140.

9) Агапкина Т. А., Топорков А. Л. Материалы по славянскому язычеству (древнерусские свидетельства о почитании деревьев) // Литература Древней Руси. Источниковедение. Л., 1988:224-236

10) KarwickaT. D^b w wierzeniach i prak-tykach magicznych / / Rocznik Muzeum Elno-graficznego w Toruniu 1978/1:49—61

11) И в а к и и Г. Ю. Священный дуб языческих славян // СЭ 1979/2

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ